# Вершы як вострыя стрэлы

## Творчая індывідуальнасць Валянціна Таўлая

УДК 821.161.309 «192/193»



**Мікалай МІКУЛІЧ,**
**кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

Мікалай МІКУЛІЧ. Вершы як вострыя стрэлы. Артыкул прысвечаны выяўленню вызначальных характарыстык творчай індывідуальнасці паэта-рэвалюцыянера Валянціна Таўлая. Аўтар разглядае працэс фарміравання мастацкай свядомасці творцы, які ажыццяўляўся на аснове балючага адчування народнай нядолі, сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту ў Заходняй Беларусі. Адзначае, што талент паэта развіваўся ў рэчышчы радыкальна-рэвалюцыйнай рамантычнай плыні літаратуры Заходняй Беларусі. В. Таўлай прытрымліваўся пракамуністычных ідэйных пазіцый, сімпатызаваў тым пераўтварэнням, якія адбываліся ў СССР.
Ключавыя словы: радыкальна-рэвалюцыйны, творчая індывідуальнасць, падтэкст, нацыянальна-вызваленчы, лірычны герой, камуністычнае падполле, сатырычна-выкрывальны пафас.

Mikola MIKULICH. Poems like sharp arrows. The article explores the defining characteristics of the creative individuality of revolutionary poet Valentin Tavlay. The author examines the themes that shaped the poet's outlook and character: the painful feeling of national misery, social and national oppression in Western Belarus. He notes that the poet went with the radical revolutionary romantic trends in literature of Western Belarus. Valentin Tavlay adhered to pro-communist ideological positions, sympathized with the transformations that took place in the USSR.
Keywords: radical revolutionary, creative personality, subtext, national liberation, lyrical hero, communist underground, satirical and denunciatory pathos.

Гэта быў адзін з самых адметных, яркіх і крэатыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага падполля і літаратурнага працэсу ў Заходняй Беларусі, хаця большую частку свайго жыцця ён правёў у турэмных засценках і друкаваўся вельмі мала, амаль усе яго вершы напісаны ў зняволенні. Восем з 33 гадоў жыцця В. Таўлай правёў у польскіх астрогах, сядзеў ва ўсіх асноўных заходнебеларускіх турмах – віленскіх Лукішках, Слонімскай, Лідскай, Гродзенскай, Маладзечанскай. Упершыню быў абвінавачаны ў дзейнасці, накіраванай на адрыў Заходняй Беларусі ад Польшчы, і кінуты за краты ў 15-гадовым узросце. Тым не менш аўтарытэт яго асобы і сілу мастацкага слова прызнавалі не толькі калегі па нацыянальна-вызваленчым руху, але і зацятыя апаненты, згоднікі і прыхільнікі паэзіі чыстай красы.

Вядомы англійскі пісьменнік У. Самерсэт Маэм сцвярджаў: «Я перакананы, што асаблівасці кніг пісьменніка напрамую звязаны з асаблівасцямі яго характару, нам далёка не бескарысна ведаць усё істотнае пра яго асабістае жыццё…» *[1, с. 211]*. Характар Валянціна Таўлая праявіўся яшчэ ў падлеткавым узросце. У вядомай аповесці «Аб сабе» (1945) ён успамінае эпізод, які меў месца на першым курсе польскай дзяржаўнай настаўніцкай семінарыі ў Слоніме:

«Пакуль настаўнік выгаварыў маё прозвішча, я ўжо стаяў. Настаўнік, нат не ўзнімаючы вачэй, задае шаблонныя пытанні…

**ПРА АЎТАРА**

МІКУЛІЧ Мікалай Уладзіміравіч.

Нарадзіўся ў 1960 годзе ў в. Закальное Любанскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага (1982), аспірантуру Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1986).

У 1987–2005 гадах працаваў у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы: асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры беларускай літаратуры. З 2006 па 2007 год – в. а. вучонага сакратара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З 2009 года – загадчык аддзела ўзаемасувязей літаратур Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Кандыдат філалагічных навук (1990), дацэнт (1997).

Аўтар каля 450 навуковых работ, у тым ліку 15 кніг і брашур.

Сфера навуковых інтарэсаў: праблемы развіцця беларускай паэзіі XX–XXI стагоддзяў.



Валянцін Паўлавіч Таўлай. 1943 год

– Нацыянальнасць? – пяро аўтаматычна выводзіць першыя літары.

– Беларуская.

Настаўнік глянуў на мяне. Недачуў. Аднакурснікі пераглянуліся таксама…

– Нацыянальнасць?

– Беларуская.

Яшчэ раз недачуў перапісчык. Я паўтарыў яшчэ раз.

– Першы раз чую пра такую нацыянальнасць. Дзе яна жыве? У Амерыцы?

– Жыве на Беларусі, напрыклад у Слонімшчыне…

– Ага!.. Гэта значыць – тутэйшыя? Та-ак!.. Але ж гэта – не нацыя. Кожны выхадзец з тутэйшых у людзі становіцца палякам ці рускім. Прытым – ты вучышся ў польскай школе… Як жа запісаць?

– Пішыце: нацыянальнасці – беларускай!..

Пачынаецца спачатку, толькі больш нервова. Вучні разяўляюцца ад здзіўлення. Я трымаюся свайго. Пяро злосна скрыпіць, запісваючы мой упарты адказ.

– Родная мова ў сям'і?

– Беларуская.

– Няма такой мовы!

– Відаць, ёсць – калі гаворым…

– Гэта мужыцкая гаворка, бескультурная трасянка, якую забываецца кожны культурны выхадзец з тутэйшых і пасля саромеецца нат прыпамінаць!

– Я не саромеюся.

І зноў ідзе доўгая, патэтычная „саната" ў прозе. Астаюся пры сваім. Злоснае пяро скончыла скрыпець. Пад грозным позіркам настаўніка сядаю, адчуваючы, што хоць бой скончыўся, але цяжкая артылерыя яшчэ загаворыць.

Яна загаварыла вельмі хутка: праз дзень-другі мяне пазбавілі стыпендыі. Адпала ахвота вучыцца. Яшчэ тыдзень – перасталі даваць есці: пакуль не заплачу за інтэрнат. Пагаладаўшы дзень-два, згрызшы апошнія сухары, у восеньскі ранак накіроўваюся пяшэчкам дамоў, на вёску. Бывай, „салідная" школа!» *[2, с. 144–145]*.

Так пачыналіся жыццёвыя ўніверсітэты паэта-рэвалюцыянера Валянціна Таўлая. Па часе яго біяграфія абрастае новымі красамоўнымі фактамі і дэталямі і ператвараецца ў інтэнсіўны жыццёва-чалавечы лёс, прысвечаны служэнню інтарэсам простага народа, рабочых і сялян. Выдатны знаўца заходнебеларускай грамадска-культурнай гісторыі У. Калеснік у гаворцы пра паэта адзначаў:

«Валянцін Таўлай, сын чыгуначных тэлеграфістаў, прыйшоў у беларускі вызваленчы рух і паэзію Гаўрошам: на адзінаццатым годзе жыцця быў выключаны з польскай школы за цвёрдую беларускасць, на трынаццатым – надрукаваў палітычны верш у газеце Грамады. Камсамольцы Віленскай беларускай гімназіі даручылі яму і А. Іверсу ў 1928 г. выдаваць вучнёўскі часопіс „Золак". На парозе свайго шаснаццатага года Таўлай спазнаў „дарослыя" катаванні на допытах у слонімскай дэфензіве, непаўналетнім сеў на лаву падсудных, васемнаццацігадовым юнаком ужо, як палітычны эмігрант, друкаваў публіцыстычныя артыкулы на міжнародныя тэмы ў „Звяздзе", а праз год быў прыняты ў партыю і, вярнуўшыся ў Вільню, стаў літаратурным, а потым і палітычным рэдактарам „Беларускай газеты", легальнага органа КПЗБ. Па яго ініцыятыве быў скліканы ў снежні 1933 г. з'езд сялянска-рабочых паэтаў і ўтвораны Літаратурны фронт заходнебеларускіх пісьменнікаў. На судзе „Малой Грамады" Таўлай атрымаў найдаўжэйшы тэрмін зняволення, восем гадоў турмы (столькі ж, колькі П. Пестрак і Я. Міско). Гэты тэрмін ізаляцыі быў юрыдычнай меркай яго прафесіяналізму як ідэолага камуністычнага падполля і важака левага авангарднага кірунку ў заходнебеларускай паэзіі» *[3, с. 17]*.

Нарадзіўся ён 8 лютага 1914 года ў сям'і чыгуначнікаў Паўла Дзям'янавіча і Марыі Антонаўны Таўлай у Баранавічах. Вучыўся ў польскіх школах у Лідзе, у вёсцы Вялікая Кракотка, у Слонімскай дзяржаўнай польскай настаўніцкай семінарыі, у Віленскай беларускай гімназіі.

Вельмі рана В. Таўлай далучыўся да заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху, камуністычнага падполля ў краі. Удзельнічаў у акцыях пратэсту супраць разгрому і забароны Грамады, у мітынгах у падтрымку звольненых і

выключаных за незалежніцкія погляды настаўнікаў і вучняў Віленскай беларускай гімназіі. У лютым 1928 года ў ліку іншых навучэнцаў быў выключаны з гімназіі і пад канвоем паліцыі адпраўлены да бацькоў. Працягваў рэвалюцыйную дзейнасць дома, на вёсцы: быў сакратаром Азярніцкага падрайкама камсамола, наладжваў работу нізавых ячэек Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ) на Слонімшчыне. У жніўні 1929 года быў арыштаваны паліцыяй. Вытрымаў цяжкія допыты і катаванні ў Слонімскай дэфензіве, атрымаў канчатковы тэрмін – два гады турэмнага зняволення. Аднак не паспелі пасадзіць: рашэннем камсамольскага падполля ён быў накіраваны ў БССР. Працаваў інструктарам Рэчыцкага райкама камсамола, потым у рэдакцыі газеты «Звязда». Адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні літфака БДУ. У 1932 годзе вяртаецца ў Заходнюю Беларусь, там вядзе падпольную работу. Уступіў у Камуністычную партыю Заходняй Беларусі (КПЗБ), быў членам цэнтральнай рэдакцыі КПЗБ (Варшава), літрэдактарам «Беларускай газеты», адным з арганізатараў Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў Заходняй Беларусі. У 1934 годзе пры чарговым пераходзе польска-савецкай мяжы разам з Я. Міско быў арыштаваны польскімі пагранічнікамі. На судзе ў сакавіку 1936 года атрымаў восем гадоў зняволення. Тэрмін адбываў у Гродзенскай турме. У верасні 1939 года да прыходу Чырвонай арміі быў вызвалены рабочымі. Да пачатку вайны жыў у Лідзе, працаваў у мясцовай раённай газеце «Уперад».

Падчас вайны В. Таўлай быў сувязным партызанскага атрада імя Р.І. Катоўскага брыгады імя Ф.Э. Дзяржынскага Баранавіцкага злучэння, выконваў важныя заданні разведкі, быў кіраўніком навагрудскай агентурнай сеткі спецгрупы «Буравеснік». Па заданні партызанскага кіраўніцтва з 1943 года жыў у Навагрудку, дзе ўзначальваў аддзел культуры абласной управы Беларускай самапомачы. З ліпеня 1944 года працаваў адказным сакратаром навагрудскай раённай газеты «Звязда». У лютым 1945 года прызначаны старшым навуковым супрацоўнікам, намеснікам дырэктара Літаратурнага музея Янкі Купалы.

Упершыню ў друку з мастацкімі творамі выступіў у 14-гадовым узросце, у 1928 годзе апублікаваўшы некаторыя раннія вершы ў газетах «Воля працы», «Сіла працы», «Чырвоная змена» і асобна паэму «Непераможная». Друкаваўся пад псеўданімамі Усяслаў Барвінец, Янка Бунтар, Янка Дванаццаты, П. Сірата, М. Гарустовіч і інш.

Першы зборнік вершаў «Выбранае» выйшаў пасля смерці паэта ў 1947 годзе. Звяртаюць на сябе ўвагу характэрныя назвы рэцэнзій на гэтую кнігу: М. Аўрамчыка – «Песні барацьбы» («Літаратура і мастацтва». 1948. 27 сакавіка), Б. Бур'яна – «Стихи, опаляющие сердце» («Сталинская молодежь». 1948. 15 кастрычніка), Р. Бярозкіна – «Паэзія мужнасці» («Літаратура і мастацтва». 1948. 24 красавіка), У. Мехава – «Песні мужнага сэрца» («Звязда». 1948. 5 сакавіка), Я. Шарахоўскага – «Паэзія рэвалюцыйнай мужнасці» («Полымя». 1948. № 3).

Мастацкі талент Валянціна Таўлая развіваўся ў рэчышчы радыкальна-рэвалюцыйнай рамантычнай плыні заходнебеларускай паэзіі. Як вядома, яе прадстаўнікі Паўлюк Шукайла, Піліп Пестрак, Алесь Салагуб, Максім Танк і іншыя прытрымліваліся пракамуністычнай ідэйнай арыентацыі, сімпатызавалі тым працэсам, якія адбываліся ў СССР. Яны сцвярджалі вобраз новага чалавека, рэвалюцыянера-падпольшчыка, камуніста – мэтаімкнёную, стойкую, мужную асобу, якая прысвяціла жыццё барацьбе за інтарэсы народа. З аднаго боку, вобраз быў у значнай ступені загадкаватаямнічым, абагульненым і нават сімвалічным, з другога – рэальнай, канкрэтнай індывідуальнасцю. Гэта быў шмат у чым праметэеўскі тып героя, самаадданага і ахвярнага змагара за высокія сацыялістычныя ідэалы жыццеўладкавання, сацыяльную і нацыянальную роўнасць і справядлівасць. Ён увасабляў волю і сілу шырокіх працоўных мас, выступаў іх ідэйным лідарам і абаронцам, выяўляў думкі і пачуцці селяніна і рабочага, плытагона і каваля, настаўніка і лекара. Яго вызначалі максімалізм аскетычнага служэння высокаму грамадзянскаму абавязку, апантанасць ідэяй радыкальнага пераўтварэння жыцця і на гэтай глебе нярэдка прасталінейнасць і нават схематызм мыслення і паводзін. Герой рэвалюцыйных рамантыкаў выяўляў пэўнае і выразнае маральна-палітычнае адзінства, прэзентаваў сябе адначасова як рашучага і бескампраміснага разбуральніка свету несправядлівасці і прыгнёту і як натхнёнага будаўніка якасна новых грамадска-сацыяльных і душэўна-чалавечых адносін. Гэта прадстаўлена ў творчасці А. Салагуба – зборнік «Лукішкі» (1929), П. Шукайлы – «Акрываўленая зямля» (1930), М. Танка – «На этапах» (1936), «Журавінавы цвет» (1937), «Пад мачтай» (1938), П. Пестрака – «На варце» (1940) і ў інш.

Станаўленне і развіццё творчай індывідуальнасці Валянціна Таўлая адбывалася на аснове балючага адчування народнай нядолі, сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту і несправядлівасці ў Заходняй Беларусі. Ён раскрываў вострыя грамадска-палітычныя праблемы і супярэчнасці, выяўляў драматычны і трагічны змест жыццёвых працэсаў, жыў высокай думкай пра радыкальнае ўзнаўленне рэчаіснасці ў адпаведнасці з камуністычнымі ідэаламі. Паводле слоў П. Пестрака, у яго творчасці «адчувалася энергічная маладая хватка хлопца, які разумеў і любіў тое, што завецца вызваленчай барацьбой, рэвалюцыяй, Савецкім Саюзам» *[4, арк. 2]*. Яна апладнялася адмабілізаванай настроенасцю на рэвалюцыйнае змаганне, ахвярнае адстойванне чалавечай годнасці беларусаў, поўнілася рамантычным «духам бунтоўнасці», няскоранасці, су-

працьстаяння засіллю. «Лагодны па натуры паэт, – падкрэсліваў У. Калеснік у артыкуле „Шляхі сацыялістычнай паэзіі“, – прымушае сваю музу пілаваць краты, крышыць муры, весці баявыя дружыны на барыкады, глядзець у вочы голаду і смерці. Суровыя малюнкі быццам нарысаваны вугалем на шурпатай турэмнай сцяне» *[5, с. 3]*.

Я – камунар! Такіх, як я, – нямала
на нашай стогнучай спакон вякоў зямлі.
Ні разу нас магнаты не зламалі,
турма і шыбеніца не змаглі.

Мiналі царствы золата і здрады, –
і ваша панаванне праміне.
Ці ж першыя вы судзіце за праўду?
Ці ж першага вы судзіце мяне?

І перад вамі на сукне зялёным
закон, падпісаны яшчэ царом.
Вы судзіце нізрынутым законам:
яго даўно разбіў народны гром.

Панове, скончыў я. Чарга – за прыгаворам.
Пайду ў турму і веру – будзе год,
калі маю прамову дагаворыць
натхнёны барыкадны кулямёт! *[2, с. 62–63]*.

Так рашуча кідаў пятнаццацігадовы В. Таўлай сваім ідэйным апанентам у вершы «Апошняе слова», які з'яўляецца адным з найлепшых у яго творчасці. Напісаны ў гродзенскім астрозе незадоўга да суда, ён уражвае высокай зместавай энергетыкай, падкрэсленай эмацыянальна-пачуццёвай насычанасцю, прамоўніцкай ударнасцю і запалістасцю. Аналізуючы гэты і іншыя вершы паэта, даследчык яго мастацкай спадчыны М. Арочка абгрунтавана даводзіў: «Творы Таўлая – нібы на адным дыханні вымаўленая суцэльная паэма. Нечувана мужная, самаахвярная паэма барацьбы. Таўлай умеў укласці ў кожнае слова ўсяго сябе, усё, чым жыў і дыхаў – калі гэта і не запісвалася непасрэдна ў радок, то ўсё роўна адчувалася ў нейкай асабліва трывалай „паставе“ слова, у інтанацыі. Словы напаўняюцца нейкай непадробнай, унутрана непахіснай праўдай, якую нельга аспрэчваць, бо вуснамі паэта загаварыў народ, наша гісторыя…» *[6, с. 13]*.

У творчасці В. Таўлая арганічна перапляталіся лірычны і эпічны пачаткі, пэўныя рэалістычныя і рамантычныя асаблівасці, характэрныя адзнакі лірыка-апавядальнай і рамантычнай стылявых плыняў. Як правіла, паэт распрацоўваў сюжэтны, падзейны і ў той жа час ёмісты ў духоўна-псіхалагічным плане, мускулісты верш. Пры ўсім тым стылявыя дамінанты творчасці В. Таўлая адпавядалі зместавым параметрам рамантычнай плыні, яе рэвалюцыйнай разнавіднасці. Менавіта яна садзейнічала раскрыццю характэрных рыс асобы паэта, яе багатага духоўна-маральнага свету, высокіх імкненняў і парыванняў.

Раннія вершы В. Таўлая «Лета», «Ці мілей ёсць што за вёскі…», «Напрадвесні» і іншыя засведчылі перапляценне шчырых і непасрэдных лірычных настрояў і перажыванняў, рамантычна-ўзвышанага адчування навакольных з'яў і працэсаў і імкнення даць ім сацыяльна-маральную ацэнку. Па меры грамадзянскага і мастацкага

**Валянцін Таўлай з жонкай Лідзіяй. Мінск, 1946 год**





Дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы Уладзіслава Францаўна Луцэвіч (у цэнтры) і намеснік дырэктара Валянцін Таўлай (трэці злева) сярод беларускіх пісьменнікаў і першых яго супрацоўнікаў. Злева направа: Піліп Пестрак, Алеся Александровіч, Янка Брыль, жонка В.Таўлая Лідзія, Алесь Бачыла. Мінск, 1946 год

пасталення паэта гэтыя два стылеўтваральныя пачаткі развіваліся і ўзмацняліся ў вершах, заставаліся ў цеснай узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці. Духоўны светапогляд лірычнага героя В. Таўлая, палітзняволенага, вызначала прага свабоды, пазнання рэчаіснасці, шырыні ўспрыняцця жыцця.

В. Таўлай распрацоўваў сімваліка-алегарычныя вобразы ночы, хмар, вясны, грому, сонца і інш., якія напаўняў глыбокім сацыяльна-рэвалюцыйным зместам, падпарадкоўваў вядучай ідэі сваёй творчасці – сцвярджэнню неабходнасці перагляду асноў грамадскага жыццеўладкавання, перабудовы свету пад вуглом якасна новых метадалагічных прынцыпаў і маральных норм. «Радзее змрок… Наперад – скок. Мы пераможам – вер! – заўпэўніваў яго лірычны герой. – Зара гарыць, пара ствaрыць Сусветны ССР» («Дванаццаць год…»). Паэт мысліў высокімі крытэрыямі і катэгорыямі, маштабнымі паняццямі, яго верш дыхаў грамадзянскім тэмпераментам, бескампраміснасцю, шырокімі сацыяльнымі даляглядамі.

Значнае месца ў паэзіі В. Таўлая належала вершу-маніфесту, вершу-гімну, вершу-маршу, вершу-патрабаванню, якія звярталі на сябе ўвагу падкрэсленай унутранай сабранасцю зместу, ёмістай і дынамічнай формай, выразнай і суровай меладычнай інструментоўкай. У іх дамінавалі аптымістычныя, бадзёра-ўздымныя, баявыя настроі і інтанацыі, выяўлялася вера ў высокія ідэалы і каштоўнасці нацыянальна-вызваленчай барацьбы, духоўную моц і сілу змагароў за народнае шчасце. «Твор, часта бязыменны, пераходзіць з рук у рукі, – адзначаў у артыкуле «Літаратура Заходняй Беларусі» В. Таўлай, – яго перапісваюць у сотнях экзэмпляраў, перадаюць тысячамі вуснаў, расказваюць, пяюць. Ён прыносіць бадзёрасьць, запальвае агонь нянавісьці і гневу, узнімае на барацьбу новыя тысячы. *Твор дзейнічае* (падкрэслена аўтарам. – *М.М.*). Ён, як востры стрэл, паражае ворага кожны дзень, кожную хвіліну» *[7, с. 6]*. В. Таўлай сцвярджаў прынцыпы «рэвалюцыйнага патрыятызму» і «пралетарскага гуманізму», сацыялістычнага інтэрнацыяналізму і класавай салідарнасці рабочых і сялян, услаўляў красу і веліч, героіку рэвалюцыйнага поступу, асаблівасці змагарнага пабрацімства, радасці яднання ў барацьбе за сацыяльную і нацыянальную свабоду і справядлівасць. Пры гэтым даволі часта ўзбуйненасць мастацкага мыслення, сацыяльна-рэвалюцыйная заклікавасць і лозунгавасць перапляталіся ў яго з характэрнымі рысамі лірычнай непасрэднасці, душэўна-пачуццёвай цеплыні і мяккасці, высокі героіка-патэтычны пафас дапаўняўся тонкімі замалёўкамі і вібрысамі.

Шмат у чым цікавым і паказальным з пункту погляду разумення асаблівасцей творчай індывідуальнасці В. Таўлая з'яўляецца яго верш «Жаўрук», напісаны 4 красавіка 1929 года, пасля выключэння паэта і многіх яго сяброў-аднадумцаў з Віленскай беларускай гімназіі, і прысвечаны «ўсім пацярпеўшым ад гвалту таварышам – вучням ВБГ». У ім аўтар імкнуўся вызначыць месца і ролю маладых змагароў у грамадскім жыцці краю, народна-вызваленчым руху. Сваю духоўна-паэтычную місію ён алегарычна суадносіў з місіяй жаўрука, які вяшчуе вясну і абуджэнне ў прыродзе, дорыць радасць аратаму, што «выходзіць аглядваць неадталыя скібы зямлі» *[2, с. 53]*. Нягледзячы на тое, што «сівер павеяў суровы, снежнай хмарай над полем затрос…», жаўрукова песня «не ашуквае», сцвярджаў В. Таўлай, «і ніколі прадвеснем у вырай шэракрылая не адляціць». Яна абавязкова прынясе вясну і абнаўленне і ў грамадскім жыцці. Пранікнёная песня жаўрука «бачыць натхнёным узрокам, / як хвалююцца жытам палі… / Думай думу аб ніве шырокай, / – хай нарогі куюць кавалі» *[2, с. 54]*.

Надзвычай моцнае эмацыянальна-пачуццёвае ўражанне пакідае верш В. Таўлая «Таварышу маёй вясны». Ён напісаны ў 1936 годзе ў турме на Лукішках пасля вяртання паэта на падпольную працу з Мінска і прысвечаны сяброўцы Кацюшы, якая там засталася. «Тут Таўлай паказаў, – падкрэсліваў П. Пестрак, – што сіла пачуцця, якая яна не была-б высокай,

можа быць вызвалена ў адшліфованым па форме вершы, што не з'яўляецца справай лёгкай. Часамі сіла пачуцця не дае магчымасці паэту корпацца ў адшліфоўцы рыфмаў» *[8, арк. 3]*.

Твор звяртае на сябе ўвагу высокай духоўна-рамантычнай настраёвасцю, тонкімі душэўна-псіхалагічнымі перажываннямі лірычнага героя, турэмнага вязня, арганічным спалучэннем і ўзаемаабумоўленасцю асабістага, прыватна-чалавечага, інтымнага і грамадска значнага, таго, што ідзе ад рэвалюцыйнага абавязку і належыць народна-вызваленчай барацьбе.

Без мяне, маладая, ідзі, – хай бярозы над шляхам не плачуць
і на сэрца твае не страсаюць вякамі навеяны сум,
бо ці ж варта тужыць, што шляхі прабягаюць іначай,
калі боль, папалам падзяліўшы, ў прасторы нясуць?

Развітаўся я з многім, з вясной толькі нашаю – нельга:
як, скажы, без яе мне дажыць да апошніх хвілін?
Помню, помню: мы неяк з табою шыпшыну сустрэлі
і не ведалі – гэта яна ці сустрэча і вочы цвілі *[2, с. 74]*.



Валянцін Таўлай з сяброўкай Кацярынай, якой прысвяціў верш «Таварышу маёй вясны». Мінск, 1932 год

Драматызм і трагізм сітуацыі заключаюцца ў тым, што лірычны герой сам выбірае шлях барацьбы да канца і свядома ідзе на абрыў у адносінах, на развітанне са сваёй сяброўкай. Ён у думках гутарыць з каханай, апелюе да яе разумення ўсёй складанасці жыццёвых абставін. Вядома, ён ведае, што і дзяўчыне нялёгка, што і яна перажывае, і яна ў тым жа душэўна-псіхалагічным стане. Рушацца мары, планы і спадзяванні на сумесную шчаслівую будучыню, наперадзе – ростань і невядомасць. Лірычны герой супакойвае сваю каханую і тым самым праз гэта імкнецца супакоіць самога сябе, застаючыся да канца верным іх узаемнаму пачуццю:

Хоць шыпшына даўно адцвіла, – засталася на памятку радасць:
захаваю паблеклы пялёстак – далёкі ўспамін, –
пранясу праз жыццё, непакорны ні бурам, ні здрадам,
каб і сэрцу цяплей, каб сінелі прыветней палі *[2, с. 74]*.

В. Таўлай у многіх вершах своеасабліва абагульняў вобразы турмы, крат, шляхоў-этапаў і інш., якія выраслі ў яго да вобразаў-сімвалаў, неслі глыбокую ідэйна-сэнсавую нагрузку, ёмісты грамадска-палітычны змест, выяўлялі характэрныя асаблівасці народнага лёсу: «Чуваць астрожнай брамы на ўсю краіну грук» («Ідзе за годам год…»), «дарога мая напаткнулася ўчора на шэрыя сцены турмы» («Дзяўчыне»), «паролю, сябры, не забудзьце, ўзышоўшы на сцежку да шчасця» («О!.. Гэта не рукі дзяўчыны…»). Яны, вершы, вызначаліся вастрынёй сацыяльнага погляду аўтара, характэрнай унутранай палемічнасцю, а таксама афарыстычнасцю сцвярджэння скандэнсаванай, экспрэсіўнай думкі, дынамікай думкі і пачуцця, асацыятыўна-метафарычнай своеадметнасцю. Менавіта гэтыя асаблівасці далі падставы У. Калесніку заўважыць, што словы ў іх «набіты туга, як зярняты ў коласе» *[5, с. 3]*. Паказальнымі тут з'яўляюцца наступныя радкі:

Я сам і пасядзець магу,
а вершам – часу шкода:
шумець ім трэба на сцягу
і калыхаць паходы.

Глядзі ў ваўчок як дзень, так ноч, –
не ўбачыш, чорт зіркаты,
што я заўзята і даўно
пілую вершам краты («Лукішскія вершы») *[2, с. 72]*.

Даследчыкі жыцця і творчасці паэта адзначаюць, што «В. Таўлай – глыбока нацыянальны паэт, беларус «з пялюшак» *[9, с. 475]*, што ён «сумяшчаў камунізм з патрыятызмам», «ягоны камунізм быў патрыятычны» *[10, с. 49]*. Гэтую думку пацвярджаюць многія факты і акалічнасці. Відаць, зусім нездарма сябар В. Таўлая А. Салагуб у артыкуле «Класавая барацьба ў літар. Заходняй Беларусі» падкрэсліваў: «Яму неабходна ўзмоцнена працаваць над засваеньнем дыялектыка-матэрыялістычнага мэтоду, над сьветапоглядам. Калі ён здолее ўсю сваю творчасьць прасякнуць бальшавіцкай партыйнасьцю, то яго поэзія будзе яшчэ ў большай ступені дапамагаць рабочай клясе будаваць соцыялізм, зьмяняць жыцьцё, зьмяняць самога сябе» *[11, с. 139]*. Як вядома, артыкул быў напісаны і апублікаваны падчас знаходжання абодвух паэтаў у Мінску.

У творчасці В. Таўлая, сапраўды, беларускі нацыянальна-патрыятычны вектар спалучаецца з ідэйна-палітычным, ідэалагічным, камуністычна-партыйным, пэўным чынам дапаўняе і ўраўнаважвае яго. Прычым гэты сінтэз беларускага нацыянальна-генетычнага, адпрыроднага і камуністычна-партыйнага своеасабліва нанізваецца на стрыжань высокай духоўнасці і маралі лірычнага героя, падпарадкоўваецца тонкай філасофска-аналітычнай мастацкай парадыгме. Душэўна-чалавечыя якасці асобы, дабро, праўда, справядлівасць для В. Таўлая былі такімі ж важнымі, як і прыналежнасць да партыі, ідэалагічныя прыхільнасці і сімпатыі, партыйныя ідэалагемы і пастулаты. «Сціплы, негаваркі, нават хваравіты з выгляду, Таўлай быў герой па духу, загартаваны камуніст-барацьбіт, – падкрэсліваў выдатны знаўца беларускіх паэтаў і паэзіі Р. Бярозкін, – і тое лепшае, што ён напісаў за сваё жыццё, цудоўна данесла да нас вось гэту супярэчлівасць, а лепш сказаць – вось гэта адзінства простай зямной чалавечай звычайнасці і вялікай, сапраўды нязломнай сілы чалавечага духу» *[12, с. 156]*. На думку даследчыка, такія творы В. Таўлая, як «Песня пра сухар», «Дзяўчыне», «Калі наспее ў сэрцы гром…», «Таварыш», «Маякоўскі па-сяброўску радзіў…», «Бацьку», «Жаўрук», «безумоўна, належаць да нашай паэтычнай класікі, бо якраз у гэтых творах выявіўся з найбольшай цэласнасцю і паўнатой жывы і праўдзівы вобраз камуніста-рэвалюцыянера ва ўсім складаным адзінстве яго гістарычнай дзейнасці і непаўторна-індывідуальных „выпадковых“ рыс характару» *[12, с. 156]*. Думаецца, менавіта таму паэзія В. Таўлая пры ўсёй яе рэвалюцыйнай заангажаванасці і характэрнай ідэйнай тэндэнцыйнасці выглядае вельмі дыялектычнай, пластычнай – арганічнай. Так, яна багатая на гарачы заклік і прамоўніцкі лозунг, але і на даверлівае прызнанне, чуласць, шчырую споведзь таксама. Яна гуманістычная, чалавечная, цёплая, а таму цікавая, заўсёды актуальная, патрэбная. Яе хочацца чытаць, ведаць, цытаваць.

Варта заўважыць, што Валянцін Таўлай паставіў сваіх даследчыкаў у даволі нязручнае становішча: пачынаючы з 1930-х гадоў пастаянна дапрацоўваў і перапрацоўваў творы. «У яго была неадольная прага дасканаласці» *[13, с. 7]*, – слушна заўважаў А. Клышка. Асабліва шмат ён працаваў над удасканаленнем сваіх твораў адразу пасля ўз'яднання Беларусі, у 1939–1941 гадах і пасля вайны, у 1945–1947 гадах, па памяці аднаўляючы і карэнным чынам перарабляючы свае астрожныя вершы. А паэмы «Песня пра сухар» і «Таварыш» наогул пісаў, рыхтуючы да друку зборнік «Шляхі і краты». (У змрочных турэмных лёхах яны былі толькі пачаты.) Пад многімі яго творамі, напісанымі ў канцы 1920-х – 1930-я гады, сапраўды, як заўважае А. Клышка, маглі б стаяць «двайныя даты» *[13, с. 7]*.

Вераснёўскі 1939 года паход Чырвонай арміі і ўз'яднанне Беларусі Валянцін Таўлай прывітаў вершамі, вызначальнай эмацыянальна-пачуццёвай танальнасцю якіх з'явілася адчуванне радасці і шчасця, сцвярджэнне свабоды, шырыні і прастору магчымасцей, якія цяпер адкрыліся.

Народ Заходняй Беларусі здабыў доўгачаканую волю, сяляне атрымалі зямлю, моладзь займела магчымасць бясплатна вучыцца на роднай мове. Жыццё на вачах перайначвалася на якасна новы лад. Лірычны герой паэта нарэшце ўздыхнуў на поўныя грудзі.

Нешматлікія вершы В. Таўлая ваеннай пары, як і многіх іншых беларускіх паэтаў, прасякнуты грамадзянска-патрыятычнай страснасцю, гарачай сыноўняй любоўю да роднага краю, клопатам пра лёс Радзімы, болем па тых, хто загінуў ці пацярпеў ад ворага, і вытрыманы пераважна ў агітацыйна-публіцыстычнай танальнасці.

В. Таўлай сачыў за важнымі навінамі з фронту, адгукаўся на падзеі партызанскай барацьбы, на становішча на акупаванай тэрыторыі. Напрыклад, ён піша гнеўны адказ на хлуслівую заяву баранавіцкага гаўпткамісара аб тым, што гітлераўцы зробяць Баранавічы «суцэльнай клумбай кветак»:

Разявіўся на каравай,
а нам пляце пра клумбы!
Ім сала, яйкі падавай:
вядома – «кветкалюбы»…
……………………………..

Відаць, таму спалілі ў дым
цвердзь камяніц, брук вуліц,
каб назаўсёды гарады
пад клумбамі заснулі («Кветкалюбы») *[14, с. 129]*.

Паэт стварае яркую псеўда-оду гандляру Беларусі, старшыні Беларускай цэнтральнай рады Р. Астроўскаму:

О, ён гандляр хоць дробны, але спрытны:
зняў капялюш перад купцом здалёк
і на рынак, толькі што адкрыты,
на продаж бацькаўшчыну павалок («Гандляр») *[14, с. 138]*.

В. Таўлай славіў абаронцаў Айчыны, народных помснікаў, партызан, паэтызаваў волю да барацьбы, рашучасць і бескампраміснасць у змаганні, сцвярджаў упэўненасць у перамозе над ворагам. Кароткія гумарыстычныя замалёўкі паэта ў стылі народнага лубка з глыбокім сімвалічным падтэкстам, гратэскавыя сатырычныя нататкі з элементамі анекдота, сатырычна-выкрывальныя фельетоны з’едліва-саркастычнага характару часта не заключалі ў сабе прамых заклікаў да зброі, на абарону Радзімы і вызначаліся глыбінёй зместу і дакладнасцю абмалёўкі з’яў і падзей, па вастрыні і трапнасці сатырычнага выкрыцця былі дужа эфектыўнымі і дзейснымі ў барацьбе з ворагам.

Паэзіі Валянціна Таўлая належыць значнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры. Яна глыбока і пераканаўча выявіла вострыя праблемы і супярэчнасці жыцця ў Заходняй Беларусі, духоўныя настроі шырокіх працоўных мас грамадства, садзейнічала актывізацыі народна-вызваленчага руху ў краі. М. Лужанін слушна адзначаў, што паэт «надзвычай праўдзіва і адкрыта расказаў сябе і не проста перадаў змест свайго ўнутранага жыцця, а прымусіў адчуць яго ў часе, на тых самых дарогах, дзе абудзілася памкненне гаварыць. Мала калі бывае, каб біяграфія паэтычнага слова так дакладна супадала з біяграфіяй стваральніка, як у Валянціна Таўлая» *[15, с. 3]*. Змагарныя падпольніцкія сцежкі В. Таўлая, а з імі і ідэйна-мастацкія пошукі працягнуліся ў вогненныя ваенныя гады, якія дарэшты падарвалі яго здароўе і жыццёвыя сілы. Паэта не стала 27 красавіка 1947 года ва ўзросце ўсяго трыццаці трох гадоў, калі, здавалася, столькі ўсяго было наперадзе. У жыцці і творчасці.

***Фота з архіва Дома Валянціна Таўлая ДУ «Лідскі гісторыка-мастацкі музей»***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 10.11.2021 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Моэм, У. Сомерсет. Искусство слова: О себе и других: литерат. очерки и портреты / У. Сомерсет Моэм. – М.: Худож. лит., 1989. – 571 с.
2. Таўлай, В.П. Выбраныя творы / Валянцін Таўлай; уклад., прадм. і камент. А. Клышкі. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 413 с. – (Беларускі кнігазбор: БК / Інстытут літаратуры імя Я. Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя 1, Мастацкая літаратура).
3. Калеснік, У. Этапы і ростані волі / У. Калеснік // Ростані волі: з заходнебеларускай паэзіі / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1990. – С. 5–40.
4. Цэнтральная навуковая бібліятэка (ЦНБ) НАН Беларусі, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 33. Воп. 1. Адз. зах. 318. Арк. 2.
5. Калеснік, У. Шляхі сацыялістычнай паэзіі / У. Калеснік // ЛіМ. – 1958. – 17 вер. – С. 3.
6. Арочка, М. Паэзія змагання: 60 год з дня нараджэння Валянціна Таўлая / М. Арочка // ЛіМ. – 1974. – 8 лют. – С. 13.
7. Літаратура Заходняй Беларусі // Хрэстаматыя рэвалюцыйнай літаратуры Заходняй Беларусі / Камісія па вывуч. Заходняй Беларусі. – Менск [Мінск: б.в.], 1933. – С. 3–19.
8. ЦНБ НАН Беларусі, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 33. Воп. 1. Адз. зах. 383. Арк. 3.
9. Арочка, М.М. Валянцін Таўлай / М.М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. – Мінск, 2001. – Т. 3: 1941–1965. – С. 457–478.
10. Калеснік, У. Усё чалавечае: літаратурныя партрэты, артыкулы, нарысы / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 381 с.
11. Салагуб, Ал. Клясавая барацьба ў літар. Заходняй Беларусі / Ал. Салагуб // Маладняк. – 1932. – № 1. – С. 135–140.
12. Бярозкін, Р. Спадарожніца часу: артыкулы аб паэзіі / Р. Бярозкін. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1961. – 234 с.
13. Клышка, А. Змагарная паэзія Валянціна Таўлая / А. Клышка // Таўлай, В.П. Выбраныя творы. – Мінск, 2014. – С. 5–44.
14. Таўлай, В. Творы / В. Таўлай. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1961. – 403 с.
15. Лужанін, М. Валянцін Таўлай / М. Лужанін // Таўлай, В. Творы / В. Таўлай. – Мінск, 1961. – С. 3–8.